Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

Наша Праўда

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 14 Вільня, Субота 21-га траўня 1927 г. Год I

Бяз маскі.

Пад той час, як польскія нацыяналісты ясна і выразна заяўляюць, што іх імкненьне — спольшчыць усіх грамадзян Польскае Рэспублікі, так-званыя польскія „паступоўцы“ і „дэмакраты“, якія на славах нібы-то вядуць барацьбу з „радзімым“ нацыяналізмам, запраўды імкнуцца да таго-ж самага, толькі стараюцца ўкрываць свае запраўдныя мэты пад гучнымі славамі аб свабодзе і роўнасьці для ўсіх грамадзян гаспадарства — бяз розьніцы нацыянальнасьці.

Даволі ўнікнуць глыбей у клясавы характар гэных „паступоўцаў“ і „дэмакратаў“, каб зразумець, што нацыяналізм пануе ў роўнай меры як сярод польскіх нацыяналістаў розных правых груп і кірункаў, так і сярод іх.

Польскія „паступоўцы“ і „дэмакраты“—гэта-ж толькі больш лібэральнае, больш левае крыло тэй самай польскай буржуазіі, правае крыло якое прадстаўляюць так-званыя „зубры“, эндэкі, хадэкі ды іншыя. А польская буржуазія ў сваім цэлым, імкнучыся да сацыяльнага панаваньня над працоўнымі масамі краю, ня гледзячы на правае ці левае крыло, роўна хоча падчыніць сваей уладзе як польскія, так і няпольскія масы, прыкрываючы супярэчнасьць інтарэсаў дзьвюх сацыяльных клясаў—еднасьцяй іх нацыянальнай. Няпольскіх работнікаў дзеліць ад польскае буржуазіі ў дадатку яшчэ і нацыянальнасьць; дык вось, каб і няпольскіх работнікаў ды сялян можна было баламуціць нацыянальнай еднасьцяй, усе групы і кірункі польскае буржуазіі роўна напружаюць свае сілы, каб перадусім спольшчыць гэных непалякоў — беларусаў, украінцаў, літвіноў і інш., а тады лягчэй будзе ўмацаваць і сваё сацыяльнае панаваньне над імі.

Польскія „паступоўцы“ і „дэмакраты“ стараюцца ўкрываць гэтае свае імкненьне, але гэта ім не ўдаецца: шыла заўсёды вылазе з мяшка! Гэтак вылезла яно і ў Вільні на скліканым імі „асьветным вечу“ 15 мая.

Веча—пасьля доўгіх прамоваў цэлага раду аратараў—прыняло дужа характэрную пастанову. Правільна выступаючы ў абарону адзінае школы для ўсіх слаёў і клясаў народу, сабраныя на вечу польскія паступоўцы і дэмакраты зьмясьцілі ў сваей рэзалюцыі пункт, у якім гаворыцца:

„*Школьны прымус*, які абыймае дзяцей ад 7 да 14 гадоў, *павінен быць тасаваны да ўсіх грамадзян Польшчы*“.

Здаецца, усё на першы пагляд дужа добра і хораша. Адзіная школа — сямёхгодка—і для сялянскага, і для работніцкага, і для панскага дзіцяці. Дый усе дзеці мусяць яе прайсьці абавязкова! — Але-ж вось бяда ў тым, што *для беларускіх дзяцей* гэты абавязак раўназначны з абавязкам *прымусовае навукі ў польскай школе*—з польскім выкладовым языком, бо беларускіх сямёхгодак урад закладаць ня зьбіраецца: прынамся дагэтуль у Заходняй Беларусі творацца толькі ці то чыста польскія, ці—ў найлепшым выпадку — польска-беларускія школы для народу, дый гэных апошніх пакуль-што на паўтраця міліёна беларусаў – толькі сямнадцаць!*). Дый няма ніякае надзеі на нейкую зьмену ў гэтым у будучыні: урад і ня думае стварыць хоцьбы адну беларускую вучыцельскую сэмінарыю, а без такое сэмінарыі наагул нельга тварыць і разьвіваць беларускія народныя школы,—тым балей, што вучыцялёў-беларусаў з вучыцельскай падгатоўкай у расейскіх сэмінарыях і на беларускіх курсах школьныя ўлады лічаць пазбаўленымі вучыцельскае кваліфікацыі. Такім парадкам аказваецца, што ўвядзеньне пры такіх варунках школьнага прымусу для ўсяго беларускага насяленьня ў Польшчы—гэта тое самае, што *прымусовая палянізацыя беларускіх дзяцей*! І рэзалюцыя польскіх „паступоўцаў“ і „дэмакратаў“—гэта-ж і ёсьць заклік да больш энэргічнае працы ў кірунку спольшчаньня беларусаў праз школу.

Мы, беларусы, мусім гэта добра запамятаць, бо-ж на дзеле адносіны да нас і польскіх эндэкаў, і польскіх зубраў, і клерыкалаў, і „паступоўцаў“, і „дэмакратаў“—*зусім аднолькавыя*. Усе роўна хочуць чым-хутчэй праглынуць наш народ і абярнуць яго ў „гной пад польскую культуру“.

Ведама, пад *буржуазную* культуру...

*) Цыфра пададзена віленскім куратарам п. Рыневічам.

ВОБЫСКІ Ў ЛЁНДАНЕ.

Што піша ангвлійская прэса.

Англійскія газэты пішуць, быццам паліцыя знайшла пры вобысках у радавым targовым прадстаўніцтве ў Лёндане шмат „кампрамітуючых радавы ўрад рэчаў“. Але-ж сам міністар унутраных спраў, на запытаньні паслоў у парляманьце, заявіў, што якраз таго дакуманту, якога шукала паліцыя, не знайшлі пры вобыску... Паліцыя „думала“, што гэты дакумант знаходзіўся ў руках аднаго з радавых урадоўцаў, дык і зрабіла вобыск, каб яго знайсьці... Гэткім чынам ці ня скончыцца ўся гэта нячуваная на Захадзе справа разгрому „нятыкальнага“ паў-дыпляматычнага прадстаўніцтва — скандальнай кампрамітацыяй самае ж Англіі?! Каб падзяліць адказнасьць перад парлямантам, міністар унутраных спраў заявіў, што вобыск быў зроблены на прапазыцыю ваеннага міністра, з ведама прэм'ера і мін. загранічных спраў Чэмбэрлена! Вось, Чэмбэрлену, можа вобыск і быў найбольш патрэбным...

Прэса паказуе, што ў касах радавых установаў знойдзена шмат ангійскіх грошаў... Дык паліцыя паклікала экспэртаў, каб праверыць, ці — не фальшывыя?! Знойдзены шыфраваныя (пісаныя ўмоўным альфабэтам) кнігі.

Але найбольш характэрна, што, як сьцьвярджае радавае радыё, паліцыя не дапусьціла гаспадароў гмаху радавых установаў — прадстаўнікоў СССР — быць прысутнымі пры вобысках! Дзеля таго радавыя ўлады дапускаюць магчымасьць, што паліцыя магла пры вобысках папросту *падкінуць патаданыя для сябе рэчы*... Радавы камісар гандлю заявіў у Маскве, паміж іншым, што ня гледзячы на ўсё, гэткімі Чанг-Тсо-Лінаўскімі штучкамі Чэмбэрлену ня ўдасцца справакаваць радавы ўрад на неабдуманыя крокі.

Водгукі вобыскаў

Па ўсім СССР адбыліся шмат людныя мітынгі пратэсту проці нячуваных гвалтаў лёнданскіх уладаў над радавым таргковым прадстаўніцтвам. Мітынгі выносяць вельмі рэзкія рэзалюцыі, заклікаючы радавы ўрад да энэргічнай барацьбы з „правакацыйнымі выступленьнямі цьвёрда-лобых лёрдаў“, якія яўна хочуць уцягнуць народы СССР у сусьветную бойню... Рэзалюцыі трэбуюць, апрача таго, абвяшчэньня гаспадарчага байкоту Англіі і перадачы ўсіх заказаў радавага ўраду іншым дзяржавам.

Нямецкая прэса аб вобысках у Лёндане.

Нямецкая прэса дае цікаўныя падробнасьці аб тым, чаму і як рабіліся слаўныя вобыскі ў радавым „Торг.-прэдстве“ ў Лёндане.

Падазрэньні паліцыі былі выклікаты вялікай вагай багажу радавых кур'ераў, якія быццам перавозілі аружжа найнавейшых сыстэмаў англійскіх фабрыкаў... Радавае пасольства прызнае, што там запраўды было аружжа: узоры, прадстаўленыя рознымі англійскімі фабрыкамі, якім радавы ўрад меўся даць заказы...

Другая нямецкая газэта піша, што радавае прадстаўніцтва ў Лёндане за 2 дні ведала аб падрыхтаваным нападзе, дык пэўна-ж „прыняло меры“...

Цяпер у лёнданскай паліцыі 45 сышчыкаў побач з масай... студэнтаў-практыкантаў (кандыдатаў у сышчыкі) разглядаюць захопленыя дакуманты Аркосу, якіх забрана ўсяго аж 7 тоннаў...

Нямецкая прэса гадае, што зробіць радавы ўрад пасьля гэткай дыпляматычнай абразы. Ведама, што пасьля аналягічнага факту ў targовым прадстаўніцтве ў Бэрліне радавы ўрад сарваў усялякія таргговыя зносіны з Нямеччынай і ўзнавіў іх толькі пасьля зьліквідаваньня выпадку. Ці парве радавы ўрад істнуючы англійска-радавы таргговы дагавор, ці не? Газэты пішуць, што трэба думаць: не.

Узнауленьне хатняе вайны у Кітаі.

Новыя баі.

Пасьля значнага перарыву ізноў страшэнна завастрылася хатняя вайна ў Кітаі. Разабрацца, хто з кім цяпер ваюе, даволі цяжка. Ваююць усе з усімі.

Пасьля развалу — з прычыны здрады Чан-Кай-Шэка — адзінага нацыянальнага фронту проці імпэрыялістаў, усе найміты чужаземных дзяржаваў кінуліся перадусім дабіваць тыя рэшткі нацыянальна-рэвалюцыйнай арміі, якая адна толькі — шляхам злучэньня сацыяльнага і нацыянальнага мамэнту і ўздыму—магла даканаць вызваленьня краю... Побач з тым — дзіўная на першы пагляд рэч: абодва павадыры кітайскай контр рэвалюцыі — паўночны і паўдзённы (Чанг-Тсо Лін і Чан-Кай-Шэк), дабіваючы Ханькоў, пачалі між сабой запраўдную вайну.

Перадавыя атрады абедзьвюх арміяў ужо спрабавалі сваю сілу ў радзе крывавых сутычак. Першыя крокі далі перавагу Чан-Кай-Шэку. Яго войска заняло частку чыгункавай лініі, якая лучыць Нанкін з Цянь-Дзінем. Места Пу-Коў армія Чанг-Тсо-Ліна пакінула бяз бою, пачаўшы аднак-жа абстрэл яго, як толькі яно было занята войскам Чан-Кай-Шэка.

Ваенныя спэцыялісты пішуць, што перамога тэй ці іншай стараны будзе вырашана перавагай артылерыі, наагул — ваеннай тэхнікі. Гэткім чынам быццам перамога забясьпечана Чанг-Тсо-Ліну. Але добрыя знаўцы Кітаю слушна кажуць, што перамогу могуць вырашыць і іншыя „псыхічныя“ чыньнікі, а перадусім—страшэнная ненавісьць да Чанг Тсо-Ліна, пануючая ў-ва ўсей яго сатрапіі... Наагул, трэба спадзявацца яшчэ розных неспадзеванак.

Што справа Чанг-Тсо-Ліна зусім ня так добра стаіць, ды што магчымы гэтыя неспадзяванкі, відаць хаця-б з таго, што раптам на сцэну тэатру вайны выйшаў, як вельмі значная сіла даўны баявік — генарал Фэнг, які, апіраючыся на Манголію, а праз яе—на СССР, выступіў на падмогу чырвонаму Ханькоў, як павадыр усіх рэвалюцыйна-нацыянальных сілаў Кітаю... Скарыстаўшы з таго, што Чанг-Тсо Лін увязаўся ў вайну з Чан-Кай-Шэкам, ген. Фэнг фарсаваным маршам пайшоў на Пэкін. Маючы аж 4 добра азброеныя арміі, ды расьцягнуўшы іх ад Калгану да Ханькоў, ген. Фэнг адначасна ўсімі чатырма ўдарыў на рад важнейшых чыгункавых вузлоў камунікацыі арміі Чанг-Тсо-Ліна. Як сьцьвярджаюць тэлеграмы, ген. Фэнг адразу стаўся „найважнейшым ваенным чыньнікам на тэрыторыі Кітаю, і яго акцыя проці Чанг-Тсо-Ліна можа быць для апошняга катастрафічнай“.

Цяпер ясна, што бліжэйшыя лёсы якбыццам страціўшай ужо зусім зьмест ды сэнс барацьбы ў Кітаі, якую ўзнавіла выступленьне „хрысьціянскага генарала“ Фэнга, залежыць ад таго, якую лінію павядзе Кантон, што здрадзіў ген. Чан-Кай-Шэк.—Калі ён, перастрашыўшыся рэвалюцыйнага ген. Фэнга, злучыць свае сілы проці яго з Чанг-Тсо-Лінам, тады ізноў да лепшых часоў пераваг у ў Кітаі здабудуць імпэрыялісты з сваімі наймітамі. Калі-ж, наадварот, Чан-Кай-Шэк злучыцца з Фэнгам проці Чанг-Тсо-Ліна, тады канец апошняга будзе справай некалькіх тыдняў...

Нажаль, апошнія падзеі, а перадусім—усё, што зроблена ў іх Чан-Кай Шэкам, даюць вельмі мала надзеі на тое, што шчасьце вызваленьня для кітайскага народу так блізка... За тое, што ў кітайскіх павадыроў не хапіла розуму і адвагі давясьці да канца так слаўна пачатае дзела, — будзе кітайскі народ расплачывацца яшчэ доўгія годы сваей—няволяй...

У апошні мамэнт англійцы вышукалі дзесьці свайго даўнага найміта, ген. Ву-Пэй-Фу, бітага, здаецца, усімі—і сваімі, і чужымі, які сядзеў сабе спакойна дома. Англійскае агенцтва паведамляе, быццам і ён паехаў у прав. Ханан—арганізаваць (пэўна-ж за англійскія грошы!) армію з 53,000 чалавек, каб ісьці на Ханькоў... Гэткім чынам, усе 4 галоўныя ваенныя павадыры кітайскіх арміяў ідуць на Ханькоў.

Разьня кітайскіх работнікаў у Шанхаі.

З Ханькоў даносяць, што ў Шанхаі, дзе — з лёгкай рукі ўзяўшага места Чанг-Кай-Шэка — ізноў гаспадараць, як і даўней, англійцы, здарыліся крывавыя сутычкі работнікаў-кітайцаў з англійскімі матросамі. У выніку сутычак англійцы перакалолі на сьмерць многа кітайцаў.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

На Балканах трывожна!

Пагроза італьянскага нападу на Югаславію

Венскія газэты паведамляюць аб вялікай трывозе, якая пануе сярод югаслаўскага ўраду — з прычыны атрыманых вестак аб яўнай падрыхтоўцы Мусоліні да аружнай акупацыі Альбаніі з мэтай далейшай вайны з Югаславіяй. 2 га траўня адбылося 3-гадзіннае пасяджэньне ўраду пад старшынствам караля, на якім разважаліся ўсе гэтыя небясьпекі. Адначасна аналягічныя весткі зьявіліся і ў францускай прэсе. Аўстрыйская прэса вельмі ўстрывожана небясьпекай італьянскага замаху на Балканы.

А вось, што піша француская газэта:

Як пішуць з Белграду, Мусоліні запрапанаваў Баўгарыі—як заплату за нэйтралітэт у часе вайны Італіі з Югаславіяй — вярнуць ёй цалком адарваную ад яе Македонію. А калі-б Баўгарыя рашылася на ўчасьце ў вайне на баку Італіі, Мусоліні абяцаў — апрача дачкі італьянскага караля ў жонкі пару Барысу — аддаць Баўгарыі яшчэ і былую баўгарскую Дабруджу, адабраную ў яе Румыніяй. Баўгарыя быццам адкінула прапазіцыі Мусоліні, заявіўшы аб сваім поўным нэйтралітэце.

Тая-ж газэта падае ня менш трывожныя весткі — аб падрыхтаваньнях на італьянскай граніцы на Балканах.

Ня сьпіць Мусоліні, ухапіўшыся крэпка за руку шляхотных англійскіх „кансэрватараў“ агульнага міру ў сьвеце.

Трывога ў Аўстрыйскай прэсе.

У сувязі з яўнай падгатоўкай Італіі да вайны з Югаславіяй, у аўстрыйскай прэсе ўзьнялася страшэнная трывога. Прэса гэтая слушна заяўляе, што—у часе вайны—італьянскае войска папросу змушана было-б стратэгічнай канешнасьцяй перайсьці аўстрыяцкую граніцу, ды заняць частку аўстрыйскай тэрыторыі.

Прэса пусьціла навет чуткі, быццам Мусоліні афіцыяльна зьвярнуўся да аўстрыйскага ўраду аб дазвол на гэта; што-ведама-ж — зусім не падобна да веры, бо ўсе італьянскія падрыхтаваньні ідуць тайна, каб Мусоліні мог у кожны мамэнт вырачыся сваіх плянаў ваяваць.

Завастрэньне клясавай барацьбы ў Англіі.

Як ужо ведама, англійскі рэакцыйны ўрад правёў праз парлямант новы закон — проці забастовак, дый наагул проці работніцкіх арганізацыяў. Закон прайшоў в. значнай большасьцю галасоў — 386 за і толькі 170 проці, але зтое пры нячувана завастрыўшайся барацьбе работніцкіх паслоў проці большасьці рэакцыйнай буржуазіі.

Прычыну завастрэньня клясавае барацьбы ў Англіі на груньце генага закону зразумець лёгка. Як ведама, нідзе работніцкая кляса ня была такой багатай ды арганізаванай, як у Англіі. Англійская буржуазія, страшэнна багацеючы з вызыску работнікаў ды вялізарных і паняволеных багатых краін па ўсей зямлі, жыла ў пэўным „сацыяльным міры“ з „сваім“ пралетарыятам. Яна „дзялілася“ з ім карысьцямі ад свайго імпэрыялізму, кідаючы яму крошкі ды аб‘едкі з свайго стала. З свайго боку і англійскі работнік у вялікшай частцы сыты і добра апрануты, трымаўся крэпка за сваю буржуазію, верыў у яе геній, ня робячы ей ніколі ніякіх перашкодаў у яе крывавых расправах у калёніях, у выкліканых ей страшэнных сусьветных войнах, у яе хітрай і агіднай імпэрыялістычнай палітыцы.

Пад націскам рэвалюцыйнага руху ў Расеі ў часе першай рэвалюцыі, англійскія работніцкія масы здабылі сабе яшчэ шмат новых прывілеяў: буржуазія рабіла ўступкі, каб не дапусьціць да выбуху, які зрабіўся ў Расеі. Дзеля гэткага выняткова выгоднага палажэньня, дзелючыся з буржуазіяй часткай яе карысьцяў ад вызыску работнікаў і сялянства іншых краёў, англійскія работнікі былі зусім раўнадушны да сацыялізму. Англійскія работнікі, галоўная маса якіх гуртавалася ў прафэсіяльных арганізацыях — Трэд Юніонах, навет сваю палітычную партыю называлі не сацыялістычнай, але проста—„Партыяй Працы“.

У 1906 г. англійскія работнікі здабылі права ствараць сабе—шляхам самаабклажэньня ў запраўднасьці зусім не прымусовага, (як заяўляе цяпер буржуазія) — палітычны фонд на выбары; здабылі права арганізаваць забастоўкі, баронячыся—праз сваю міліцыю—ад штрэйкбрэхераў, і г. д. І вось больш за 20 гадоў істнавалі ўсе гэтыя правы ды „прывілеі“ работніцкай класы, якія цяпер скасаваны новым законам.

Цяпер пабачым, як зьмянялася гэтая пекная ідылія сацыяльнага міру ў Англіі. Забастоўкі бывалі, зразумела, і тады, але былі яны пераважна чыста эканамічныя, хаця заўсёды кожная мела, дый мусіла мець — пэўныя палітычныя мэты націску на ўрад, які заўсёды цягнуў у бок буржуазіі.

Цікаўную аргумэнтацыю неабходнасьці закону проці забастовак даў у сваей апошняй прамове англійскім міністар Чэрчыль, адзін з стаўпоў рэакцыйнага габінэту Балдвіна. Ён падлічыў, што забастовачны рух у Англіі так шпарка расьце, што яўна пагражае Англіі сацыяльна-эканамічнай катастрофай, калі загадзя ня будуць прыняты „крайнія меры самаабароны“...

Лічбы, паданыя Чэрчылем, запраўды ж характэрныя.

За 7 гадоў—1900—1906 — Англія страціла ўсяго 20 мільёнаў рабочых дзён на забастоўкі; у сямілецьці 1907 — 1913 страчана ўжо 86 мільён. дзён працы, а ў паваенным сямілецьці—1920—1927 — страчана на забастоўкі аж 322 міліёны рабочых дзён.

Як бачым, узрост запраўды-ж папросту катастрафічны!

І вось, разважае Чэрчыль, дзяржава (чытай: буржуазія) ня толькі мае права, але папросту павінна бароцца з гэтым злом мерамі паліцэйскай рэпрэсіі... І тут ізноў, як усягды, тлумачэньне зьявішча, над якім варта спыніцца больш уважна, абмяжоўваецца агітацыяй камуністаў! А ведама, як гэты „камунізм“ аблягчае для ўраду паліцэйскую барацьбу з зложнымі зьявішчамі сацыяльна-эканамічнага характару.

Адна рэч прыдала асаблівую вострасьць узгарэўшайся спрэчцы ў Англіі. Справа ў тым, што работніцкія арганізацыі ды барацьбяныя рухі захапілі і дагэтуль нейтральную ды пакорную бюрократычную клясу дзяржаўных урадоўцаў. І вось новы закон, ламаючы правы і „прывілеі“ работнікаў, асабліва востра забараняе забастовачныя выступленьні дзяржаўным урадоўцам, вымагаючы ад іх поўнай пакорнасьці ўраду.

Паслухаем яшчэ апошнюю прамову таго-ж мін. Чэрчыля ў іншым месцы. Уся прамова скіравана—проці сацыялізму, якога рэакцыянэр зусім не аддзяляе ад камунізму; абое рабое!

„Паўстаньне сацыялістычнага руху ў Англіі скіравана проці асабістае і нацыянальнае волі ў краі... Сацыялізм імкнецца да таго, каб побач з дзяржаўнай уладай ураду паставіць іншую ўладу — ўладу работніцкай клясы... Пара з гэтым скончыць“!

З гэтага ясна, што англійская работніцкая кляса яўна выйшла з пад апекі буржуазіі, пачула сябе пралетарыятам дый побач з сацыяльнай—пачала і палітычную барацьбу з буржуазіяй — за ўладу. Спроба „дапушчэньня дабравольнага „работніцкага габінэту да ўлады (ўрад Макдональда 1924 — 1925 г.) скончылася, як ведама,—ў некалькі месяцаў, але работнікі не на жарты пачулі смак улады... Што гэтая барацьба ня спыніцца, але будзе завастрацца штодня, у гэтым ня можа быць сумліву.—У часе дыскусіі над законам работнікі тлумачылі сваю „адносна лагодную яшчэ барацьбу“ — тым, што закон будзе скасаваны ў першыя дні, як толькі работніцкае міністэрства ізноў возьме ўладу...

Цяпер трэба яшчэ растлумачыць, чаму-ж гэта калісь такі мілы буржуазнаму сэрцу, ды спакойны англійскі рабачай-буржуа, заможны калега прамыслоўца ды гандляра-імпэрыяліста ў вызыску розных „каляровых“ краін на ўсей зямной кулі, раптам ператварыўся ў пралетарыя — барацьбіта за агульную справу вызваленьня Працы, прыняўшы ўчасьце ў вайне вялікай сусьветнай арміі Працы на ўсей зямлі?! — Англійская буржуазія вінаваціць ізноў — камуністаў... Але ж ці ня больш вінавата сама гэтая англійская буржуазія, якая сваімі войнамі ды авантурамі давяла ўжо да страшэннага зьбядненьня дый вядзе далей да катастрофы сваю дзяржаву, якую пабудавала на такім сацыяльным ды міжнародным ладзе, які, як ясна цяпер, надалей утрымацца ня можа?!... Паняволеныя народы сьвету вызваляюцца ўсьцяж; англійскі імпэрыялізм падае, падыхае; англійская буржуазія бяднее, дыскрэдытуецца палітычна і маральна; маючы ўсё меншыя зыскі, яна ўсё менш жадае дзяліцца імі з сваім работнікам; англійскі работнік усё менш астаецца буржуа, але ўсё больш робіцца пралетарам, як і ўсе іншыя рабачаі на сьвеце, ды пачувае ўсё больш міжнародовую салідарнасьць Працы і барацьбы яе проці Капіталу.—Але Капітал, які яшчэ мае дагэтуль сваю паліцыю, свае арміі ды гарматы з кулямётамі, чуе яшчэ сябе даволі сільным, каб спрабаваць нейк „адбудавацца“. — Капітал, які гэтак „сфашызаваўся“, падмацаваўся ў цэлым радзе краёў сфашызаваўся ў Англіі, і выяўленьнем гэтай фашызацыі англійскай буржуазіі і зьяўляецца закон проці работнікаў, як клясы—пралетарыяту.

Сацыяльная і палітычная барацьба ў Англіі завастраецца адначасна з упадкам упрывілеяванага палажэньня Англіі, як буржуа-эксплёататара народаў, што пачалі вызваляцца дый ськідаць з сябе англійскае ярмо. І калі ў помачы паняволеным народам вінаваты бальшавікі, дык тады запраўды маюць рацыю англійскія рэакцыйныя міністры, лічучы вінавайцамі сваей бяды — „камуністаў“...

Па сьлядох беларусаў.

Літоўская прэса, як ужо ведама, пад уплывам ковенскіх фашыстаўскіх настрояў, у апошнія часы выявіла сваё яўна варожае адносіньне да радыкальнага беларускага кірунку, а перадусім да Грамады і блізкіх да яе па сваей ідэалёгіі дзеячоў. Дык вось асабліва характэрным зьяўляецца нядаўнае выступленьне газэты „Vilniaus Aidas“ (з 7-га траўня), якая, кажучы аб польскіх абяцанках нейкіх дробных уступках беларусам (а як-жа: чакайце!), робіць з гэтага вывад, што ўсе гэныя ўступкі зьяўляюцца вынікам... дзеяльнасьці тэй самай, ненавіснай для літоўскага фашызму, Грамады!

Літоўская газэта заканчывае сваю стацьцю заявай, што літвіны ў сваей нацыянальнай і сацыяльнай дзеяльнасьці пад Польшчай ішлі больш „спакойным, лёгальным“ шляхам, але гэта мела такі вынік, што цяпер аб літвінох у ўрадавых сфэрах нічога не гавораць, літоўская мова паступова занікае, асьвета ледзь жыве. „Беларусы навучылі нас, што толькі змаганьнем і страхамі можна нечага дабіцца ў нашых валадароў“.

Ну, літвіны дасталі правы для сваей гімназіі ў Вільні, якіх беларуская гімназія ня мае! Але тут адыграла рашучую ролю, здаецца, нешта іншае: справа спадзяванага паразуменьня Варшавы з Коўнай....

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Арыштаваньне эндэцкай баёўкі ў Варшаве.

У суботу, 14 траўня, у Варшаве зроблены неспадзяваны вобыск у гмаху так-званай „Стражы Народовай“ і ў чысьленых яе сяброў. Вобыск, як піша „Роботнік“, сьцьвярдзіў, што шмат сяброў эндэцкіх баёвак мелі аружжа без дазволу ўладаў, што ў гмаху Стражы хаваліся бомбы і іншыя прадметы амуніцыі. Сьцьверджана, што баявікі рабілі так-званыя „сьлезаточныя бомбы“, якія ўжываліся дзеля разбіваньня мітынгаў іншых партыяў. Разрыў гэтых бомбаў вытварае шмат едкіх газаў, ад якіх льлюцца сьлёзы ды шчыпле ў носе, што выклікае кашаль ды чыханьне. А калі гэтак закашляе ды зачыхае якая тысяча асоб, дык, ведама-ж, канец усялякім прамовам!

У выніку вобыскаў арыштавана многа баявікоў, сярод іх—капітан Полоньскі, рэдактар „Мысьлі Народовай“ Кавалеўскі і інш.

„Роботнік“ кажа, што гэтая баёўка мела лучнасьць з Абозам Вялікай Польшчы Дмовскага, ці была прыладай гэтай фашыстаўскай групы. Забрана паміж іншым багатая перапіска баёўкі, між якой ёсьць лісты ген. Галера і інш.

Правая прэса страшэнна абураецца на гэтыя арышты. — Апрача нарушэньня Канстытуцыі, бясспрэчна бяспраўнага толькі тады, калі арыштоўваюць правых дзеячоў, — правая прэса бачыць у гэтым пагрозу і для ўсіх выбарных сабраньняў правых партыяў— у сувязі з выбарамі ў варшаўскі самаўрад...

Ну, а як арыштавалі левых паслоў, ды йшчэ беларусаў, дык правыя газэты ажно сьліну ад радасьці пускалі і ўсё прызнавалі „законным“...

Пратэст польскага ўраду проці прамовы мін Гэргта.

Польскі ўрад загадаў свайму паслу ў Бэрліне пратэставаць асабіста проці антыпольскай прамовы нямецкага міністра Гэргта.

Пасьля перагавораў аб форме, якая-б здаволіла польскі ўрад, быў выданы афіцыяльны камунікат нямецкага ўраду, у якім той, сьцьвярджаючы мірны характар нямецкай палітыкі, кажа, што заўсёды гатовы да вырашэньня ўсіх спрэчных пытаньняў з Польшчай—шляхам паразуменьня

Польская правая прэса называе гэты адказ—„выкручываньнем“...

„6 шпіёнскіх арганізацыяў на пагранічча“.

Польская прэса паведамляе, што за 4 апошнія тыдні на пагранічча з ССРР выкрыты і зьліквідаваны аж 6 шпіёнскіх арганізацыяў...

Кабета літоўскі шпіён.

„Дзен. Віл.“ паведамляе, што ў Вільні арыштавана кабета З., якая займалася шпіёнствам на карысьць літоўскага ўраду, да чаго ў канцы быццам прызналася сама.

Заграніцай.

Новы англійскі націск на Літву.

Рыжская прэса наказуе, што англійскі ўрад ізноў афіцыяльна паведаміў Коўну, што англійскія фірмы ня будуць сплаўляць польскага лесу па Нёмне, пакуль літоўскі ўрад не ўрэгулюе сваіх адносінаў да Польшчы. Англійскія фірмы ня будуць рабіць ніякіх праектаваных работаў па перабудове ды пашырэньні літоўскіх чыгункавых шляхаў да таго часу, лічучы гэтыя выдаткі непрадукцыйнымі.

Заявы радавай дэлегацыі ў Жэнэве.

У гутарцы з прадстаўнікамі прэсы радавыя дэлегаты заявілі, што Рады пастанавілі прыняць учасьце ў канфэрэнцыі—з мэтай спраўдзіць магчымасьць сумеснага істнаваньня капіталістычнай і камуністычнай гаспадаркі. Дэлегаты заявілі, што палоханьне буржуазнага капіталу—лёсам яго ў ССРР — недарэчна: заграгічны капітал загарантаваны ў ССРР ня горш, як і ў царскія часы. ССРР патрабуе аж 3 мільярды залатых рублёў замежнага капіталу, каб прысьпяшыць разьвіцьцё сваей прамысловасьці. Што датычыць францускіх даўгоў, дык справа ўжо аканчальна высьветлена і прынцыпова вырашана. У хуткім часе перагаворы дадуць зусім рэальныя рэзультаты.

Новая прапазыка радавага ўраду Францыі.

Радавая дэлегацыя запрапанавала францускаму ўраду сплату даўгоў — натурай: бакінскай нафтай, якая будзе пакрываць цалком усю патрэбу Францыі. Як ведама, францускі ўрад мае ўвясьці манаполію на нафту.

Новы канфлікт між Нямеччынай і Францыяй.

Выконываючы ведамую Парыжскую ўмову, нямецкі ўрад мае ў хуткім часе скончыць збурэньне ўсіх паказаных у гэтай умове крэпасьцяў на ўсходняй граніцы Нямеччыны. Дык само сабой высунулася непрадбачанае тады пытаньне; хто-ж мае сьцьвердзіць факт збурэньня—факт выкананьня нямецкім урадам умовы? Францускі ўрад запрапанаваў, каб гэта зрабілі тыя-ж „ваенныя спэцыялісты“, якія раней складалі скасаваную ў пачатку году „ваенна-кантрольную камісію“. Нямецкі ўрад рашуча запратэставаў, заявіўшы, што „адраджаць гэты ваенны кантроль саюзьнікаў“ ня зьбіраецца. Нямецкі ўрад заявіў, што даволі будзе, калі ён сам аўтарытэтна заявіць, што ўмова выканана. Калі францускі ўрад усьцяж націскаў на скантраляваньні збураных будынкаў, немцы запрапанавалі стварыць кантрольную камісію—з прадстаўнікоў нэйтральных дзяржаў: Швэцыі ды Швайцарыі. Францыя не згаджаецца і на гэта: Пуанкарэ заявіў, што ён „павінен асабіста быць у курсе ўсяго, што зроблена на мейсцы“.

Як выйдуць з гэтага непрызваітага спору, добра рысуючага „маральнае разбраеньне“ ды „лёкарнскі дух“, пануючы на Захадзе,—няведама!

Згодна з духам гаспадарчага Лёкарно.

У Англіі выклікала вялізарнае абурэньне пастанова францускага ўраду — дапамагчы краёвай вугальнай прамысловасьці Францыі шляхам значнага павялічэньня мытаў на англійскае вугальлё, фактычна зачыняючы гэтым яго ўвоз у Францыю. Гэткім чынам 12 мільёнаў тоннаў англійскага вугальля, якія прымаў францускі рынак, астануцца дома. Гэта цяжка ўдарыць па англійскім тарговым балянсе, і без таго вельмі некарысным.

А канфэрэнцыя ў Жэнэве разважае спосабы — зьнішчэньня бар‘ераў для ўвозу ды вывазу.

Прэзыдэнт Францускай Рэспублікі ў Лёндане.

Прэзыдэнт Францускай Рэспублікі Думэрг разам з Брыянам прыехалі ў Лёндан, як госьці англійскага караля. Прысутнасьць Брыяна паказывае на тое, што візіта мае

„Sprawy Narodowościowe“.

Нам дастаўлены № 1 новага польскага месячніка — пад вышэйпаданым загалоўкам. Месячнік „ахвяраваны высьвятленьню справаў нацыянальных меншасьцяў“ у Польшчы і па-за Польшчай.

Каб з‘арыентавацца ў характары і мэтах часопісі, разгледзім сьпярша гісторыю паўстаньня гэтага выданьня, як яна дадзена ў ім самым.

У сьнежні 1921 г. рад асоб, сярод якіх былі гэткія дзеячы, як п. Голувко, Познэр, праф. Кшывіцкі, Кухажэвскі, Тугутт і інш., залажылі новую „навукова грамадзкую пляцоўку“, якая мела-б заданьнем высьвятленьне палажэньня і разьвіцьця нацыянальных меншасьцяў у Польшчы, выходзячы з тэй думкі, што разьвязваньне меншасьцёвых пытаньняў трэба распачаць—ад дакладнага ды ўсебаковага пазнаньня народаў, якія жывуць на абшары Польскай Рэспублікі. Гэткім чынам быў закладзены—„Інстытут дзеля Досьледаў Нацыянальных Спраў“.

Што-ж, думка, мо‘ й слушная. Толькі, перад тым, як у сьнежні 1921 г. закладываць гэты „Інстытут“ для вывучэньня няведамых польскаму грамадзянству народаў, было-б можа яшчэ больш слушна-ўстрымацца ў сакавіку таго-ж 1921 году ад... падпісаньня Рыжскага Трактату, паводле якога польскае грамадзянства ўзяло на сябе абавязак кіраваньня лёсам тых народаў, не запытаўшыся ў іх згоды на гэта.

„За час (ад заклалзінаў аж) да пачатку 1924 г. дзеяльнасьць Інстытуру абмяжоўваецца радам дыскусыйных сабраньняў“. „Нажаль, высока няпрыхільныя агульна-палітычныя варункі не дазволілі Інстытуту разьвівацца далей, так што ў 1924 і 1925 г.г. наступіў перарыў у яго працах“.

Што няпрыхільнасьць да нацыянальных меншасьцяў заўсёды йшла ў Польшчы з „высокага мейсца“, гэта праўда. Але—ці ня дзіўна толькі, што найбольш няпрыхільным часам для вывучэньня меншасьцёвых спраў у Польшчы часопісь Інстытуту, з яго прэзэсам паслом Тугуттам на чале, лічыць якраз г.г. 1924-25 калі справы меншасьцёвыя былі адданы якраз віцэ-прэм‘еру п. Тугутту?! Выходзе, што тыя самыя людзі, якія ў 1921 годзе толькі йшчэ зьбіраліся заняцца вывучэньнем тых чужых, няведамых ім самастойных нацыянальных сьветаў, якія былі парэзаны ды захоплены польскім аружжам,— як самі дарваліся да ўлады, дык кінуліся „жондзіць“ гэтым жывым чалавечым матэрыялам, загадываць, накідываць свае „законы“ гэтай жывой прыродзе, якой яны яшчэ ня вывучылі, будуючы сваю „дзяржаўна-творчую працу“ на сваім поўным нязнаньні, да чаго спачатку самі-ж прызналіся... І трэба прызнацца, што з усей „лявіцы“, як раз пасол Тугутт, ён-жа—б. віцэ-прэм‘ер і тварэц слаўных двух-язычных законаў 31 ліпня 1925 г., скампрамітазаны гэтым можа больш, чым хто іншы ў Польшы...

Толькі ў пачатку 1926 году... паны закладчыкі Інстытуту пастанавілі ўваскрасіць дзеяльнасьць Інстытуту. Мімаволі натуральная цікавасьць насоўвае пытаньне: чаму толькі цяпер — пасьля 4—5 гадоў сьпячкі, ці „летаргічнага сну“, як дэлікатна азначыў сам п. Тугутт? І чаму-ж гэта ізноў прайшоў аж цэлы 1926 год, пакуль уваскрос Інстытут, ды першым чынам стаў выдаваць свой орган „Справы“.

Адказ на гэтае пытаньне можа знойдзем на стр. 92 № 1 часопісі. У аддзеле „Рэцэнзіі“. У рэцэнзіі аб часопісі „Natio“ чытаем:

„На радзе канфэрэнцыяў, якія адбыліся ў працягу некалькіх месяцаў паміж прадстаўнікамі нацыянальных меншасьцяў у Сойме ...абгаварывалася справа выдаваньня супольна часопісі, якая мела-б мэтай дакладнае высьвятленьне палажэньня і патрэбаў нацыянальных меншасьцяў у Польшчы“... „Пасьля ўзгодненьня паглядаў прадстаўнікоў розных меншасьцяў, пастаноўлена выдаваць месячнік „Natio“... Як ведама, гэты месячнік „Natio“ добра ці дрэнна, але мае ў 4-х эўрапэйскіх мовах інфармаваць сусьветную апінію аб жыцьці меншасьцяў у Польшчы, ведама-ж—з пункту гледжаньня свайго, меншасьцёвага“...

Гэткім чынам, пададзеная самай часопісяй Інстытуту хронолёгія найлепш паказвае на мэты і характар новай польскай „навукова-грамадзкай пляцоўкі“. Польскае грамадзянства, навет у асобах яго лепшых, можа запраўды найшчырэй ды найпаважней зацікаўленых у нацыянальных справах у Польшчы прадстаўнікоў, заінтэрэсавалася ізноў „бесстароньнім досьледам справаў меншасьцяў у Польшчы“ — толькі тады, калі клюбы гэтых меншасьцяў у Сойме пачалі рыхтавацца да выданьня свайго органу. „Справы Народовосьцёвы“ выйшлі з друку беспасрэдна ўсьлед за выхадам „Natio“.

Ясна, што „Справы“ маюць першым заданьнем—паралізаваць тую шкоднасьць для Польшчы інфармаваньня сусьветнай апініі, якую будзе рабіць „Natio“.

Гэткім чынам, зусім не выключаючы пэўнага імкненьня часопісі да „бесстароннасьці“ ды „апалітычнасьці“ ў справах навуковага дасьледу жыцьця меншасьцяў у Польшчы, трэба мець на ўвазе, што ўся справа „Справаў“—перадусім і агулам—чыста палітычная.

(Канец будзе)

і спэцыяльны дыпляматычны характар і асаблівую вагу ў галіне замежнай палітыкі абодвух краёў.

Сярод спраў замежнай палітыкі, якія цікавяць абедзьве дзяржавы, ды ў якіх яны дагэтуль вялі розную, часам папросту супярэчную палітыку, ёсьць цэлы рад асабліва палючых. Паміж імі — справы: кітайская, нямецкая, радавая, італьянска-югаслаўская, як справы — першай вагі.

У-ва ўсіх гэтых справах Чэмбэрлен хоча прыцягнуць да супрацоўніцтва францускі ўрад — у асабліва прыемных варунках: у часе ўрачыстасьцяў каралеўскага прыняцьця высокіх гасьцей...

Барацьба за права забастоўкі ў Англіі.

Барацьба работніцкіх паслоў у парляманьце ня скончылася з прыняцьцем урадавага закону. Сама ўрадавая большасьць, атрымаўшы такую перамогу ў парляманьце, баіцца тасаваць закон у тым відзе, як ён прыняты, дык ізноў аддала яго — у камісію. Работніцкія паслы будуць бараніць правы пралетарыяту да апошняга і ўнясьлі да гэтага закону больш за 300 папраўак.

Канфэрэнцыя Малай Антанты.

Адбылася Канфэрэнцыя Малай Антанты ў м. Яхімове (Чэха-Славакія).

Камунікат трох міністраў сьцьвярдзіў, што Малая Антанта (— ну, ведама-ж)! ніколі ня была такой сільнай ды трывалай, як цяпер, што ўсе чуткі аб яе развале ці аб непаразуменьнях у яе лоне — хлусьня! Надалей Малая Антанта пільнуе шанаваньня міжнародавых умоваў і ўтрыманьня створанага імі ладу.

На Канфэрэнцыі з прадстаўнікамі прэсы румынскі міністар казаў: што Румынія астанецца добрым саюзьнікам Югаславіі, а адначасна — зусім ня горшым прыяцелем Італіі (якая хоча пабіць Югаславію)?... Югаслаўскі міністар казаў, што справа адбудовы габсбурскага трону ў Вэнгрыі істнуе толькі на старонках газэтаў...

Канфэрэнцыя пастанавіла не пратэставаць проці зьняцьця Радай Паслоў ваеннага кантролю з Баўгарыі.

У Вэнгрыі маюць зрабіць караля.

Нямецкія газэты даведаліся праз Вену аб тым, што ў Вэнгрыі ў хуткім часе адбудзецца—„вялізарнай палітычнай вагі здарэньне“. А іменна: будзе абвешчаны каралём прынц Отто Габсбургскі.

ХРОНІКА.

Беларускі Выбарны Камітэт. Захады падлізьнікаў буржуазіі—хадэкаў і сельсаюзьнікаў—перад жыдоўскімі буржуазнымі партыямі, каб „падаравалі“ ім адно мейсца на сваім сьпіску на выбарах у мястовую раду ў Вільні, — зразумела-ж, скончыліся няўдачай. Адначасна хадэцка - сельсаюзьніцкая кумпанія сваім паступаньнем ясна паказала, што ніякіх уплываў у Вільні яна ня мае і ня можа спадзявацца на здабыцьцё сваімі сіламі хоць аднаго мейсца ў мястовай радзе.

Наадварот, віленскія беларусы работнікі, акраінная бедната і працоўная інтэлігенцыя, якая з агідай адварачаецца ад хадэцка сельсаюзьніцкіх палітыканаў, — веручы ў свае сілы і нікому ня кланяючыся, пастанавілі прыступіць да выбараў пад сваім уласным сьцягам. З гэтай мэтай і стварыўся самастойны Беларускі Выбарны Камітэт, які ці то выставіць свой самастойны сьпісак кандыдатаў у радныя места Вільні, ці войдзе ў блёк з другімі выбарнымі арганізацыямі, якія маюць блізкія да ягоных мэты.

У склад Беларускага Выбарнага Камітэту ўваходзяць: старшыня: Чыжэўскі Ігнат, скарбнік: Сьвятоха Анна, Сэкрэтар: Барабанаў Пахом. Камітэт месьціцца на вул. Субач 2 у гасьцініцы Англія.

Пачынаньне Камітэту трэба шчыра прывітаць. Спадзяемся, што яму ўдасцца згуртаваць беларускія сілы места Вільні і дабіцца для беларусаў прадстаўніцтва ў мястовай радзе сталічнага места Заходняе Беларусі.

Перадвыбарная брахня польскае прэсы. У сувязі з падгатоўкай да выбараў у мястовую раду ў Вільні, польская прэса, ня маючы ніякіх інфармацыяў аб тым, што робяць беларусы, сьвядома выдумляе розную ілжу аб беларусах. Гэтак польскія газэты выдумалі, быццам арганізуецца нейкі блёк беларусаў, літвіноў, немцаў і расейцаў, а пасьля гэны-ж няістнуючы блёк жыўцом „пахаранілі“. Але не абмінулі нагоды, каб не падпусьціць і дэфэнзыўнага духу: гэтак „Слово“ абвясьціла, быццам на адным з такіх нябылых сходаў „блёку“ сьвяшч. Коўш, якога толькі нядаўна звольнілі пад залог з вастрогу ў Вронках, абяцаў „фінансаваць выбарную кампанію“, ды быццам беларусы вракліся месца ў радзе для свайго прадстаўніка!

Калі сьв. Коўш паслаў у рэдакцыю „Слова“ запярэчаньне, яно, ведама-ж, ня было надрукована. Ясна: гэныя брахлівыя весткі фабрыкуе тая-ж праступная рука, якая так агідна фальшавала праўду аб арыштаваных у студзені беларускіх грамадаўскіх паслах і грамадзкіх дзеячох...

Нацыянальныя справы. У тым тыдні ў Вільню прыяжджаў арганізатар так-званага Інстытуту дзеля дасьледаваньня нацыянальных спраў ў Польшчы, пасол Тугутт, каб адчыніць у Вільні Літоўска-Беларускую Сэкцыю гэнага Інстытуту, як відаць з назову — празначаную дзеля вывучэньня літоўскага і беларускага пытаньняў. На паседжаньне, якое адбылося ў кватэры пасла Хаміньскага 10-га траўня, апрача палякоў, былі запрошаны і прадстаўнікі беларускага грамадзянства, а таксама і літвіноў. Аднак, літвіны адказалі, што не пасьпелі абгаварыць паміж сабой пытаньне аб супрацоўніцтве з Інстытутам, і ня прыйшлі. З беларусаў былі: пасол Ярэміч, грам, Ант. Луцкевіч, і д-р Ян Станкевіч.

Калі пас. Тугутт выясьніў сабраным мэты і заданьні Інстытуту, **пас. Ярэміч** заявіў, што ён баіцца ў працы Інстытуту ўкрытае палітыкі, дый з увагі на настроі ў беларускім грамадзянстве, якое недаверчыва глядзіць на ўсіх, хто мае якія-колечы зносіны з палякамі, — будзе прымаць учасьце ў сходзе толькі як наглядчык. **Грам. Луцкевіч** з свайго боку адзначыў, што выкрываньне праўды аб беларусах павінна цікавіць кожнага беларуса, і беларусы маглі-бы дапамагчы Інстытуту ў шуканьні гэнае праўды: на-жаль, няма ніякае пэўнасьці, што Інстытут будзе праўду аб беларусах падаваць об'ектыўна ў сваей часопісі „Справы Народовосьцёвэ“. Грамадз. Луцкевіч адзначыў, што сярод сабраных на сход асоб ён бачыць рэдактара часопісі, друкаванае ў беларускай мове („Беларускі Дзень“), які выявіў ужо сваю „об'ектыўнасьць“ у тым, што напісаў у сваей газэце, быццам польскія ўнівэрсытэты стаяць расчынены насьцеж для беларускіх матурыстаў, і яны толькі затым выяжджаюць заграніцу, што іх нейкія палітыканы намаўляюць да байкоту польскіх вышэйшых школ і польскае навукі. Тымчасам усім прысутным дужа добра ведама (былі прысутны некалькі прафэсароў Віленскага Унівэрсытэту), што справа прадстаўляецца якраз наадварот: беларуская моладзь прымушана ехаць у заграпічныя ўнівэрсытэты, бо ў польскія ня мае доступу... Дык, калі такія людзі, як гэны рэдактар (п. Умястоўскі), будуць судзіць аб тым, што праўда, а што — не, — беларусы ня могуць браць учасьця ў адказнасьці за вынікі працы Інстытуту ў галіне шуканьня праўды аб беларусах. Такім парадкам і ў склад Інстытуту беларусы ўвайсьці ня могуць. З гэтым становішчам згадзіліся і другія прысутныя беларусы.

Усё-ж сход пастанавіў закласьці літоўска-беларускую сэкцыю Інстытуту ў Вільні, хоць яна будзе складацца з адных палякоў — без беларусаў. Справа ўчасьця літвіноў асталася нявырашанай з прычыны іх адсутнасьці, дый з прамоваў некатарых прадстаўнікоў польскага грамадзянства не выглядала, каб усе яны лішне шкадавалі гэтага...

З арыштаванымі пасламі не даюць бачыцца. Ад 3 сакавіка жоны заарыштаваных беларускіх паслоў-грамадаўцаў і культурных дзеячоў, вывезеных з Вільні ў Вронкі (каля Пазнані), ня могуць дабіцца дазволу пабываць у сваіх мужоў. Усе просьбы астаюцца бяз водкліку. Прычына гэтае забароны бачыцца з сваімі—няведамая.

Прыгавор у справе 32. У Горадні закончылася справа 32-х беларусаў, абвінавачаных у процідзяржаўнай дзеяльнасьці. 6 асоб засудзілі на 3 гады кожнага ў вастрог, 9—па 2 гады, 2—па паўтара году, 4—па 1 годзе. Дзевяцёх абнявінілі.

У часе судовае расправы заарыштаваны двое сьведкаў, якіх вінавацяць у фальшывых паказаньнях.

Арышты ў Пастаўскім павеце. У вёсцы Кушыцы, Пастаўскага пав., паліцыя заарыштавала грамадзян Асічэнку, Бяляўку і Андрона. Як падае „Слово“, іх вінавацяць у прыналежнасьці да камуністычнае партыі.

Вываз „высокага“ вязьня. Генарал Развадоўскі, які ад часу маёвага перавароту сядзеў у Вільні ў ваенным вастрозе на Антокалі, надовячы вывезены ў Варшаву, дзе мае адбыцца над ім суд.

Вечар беларускіх аўтараў. У гэту суботу адбудзецца абвешчаны ўжо даўно вечар беларускіх аўтараў, якія будуць чытаць свае творы. У Вільню ўжо прыехала на гэты вечар наша выдатная маладая паэтка Натальля Арсенева, творы якой будуць таксама чытацца на ім. Выступаць будуць і „наймаладзейшыя“ з нашых паэтаў.

Вечар адбудзецца ў памяшчэньні Цэнтральнага Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў Вільні (вул. сьв. Анны 2). Пачатак у 7 гадз. увечары. Уваход бясплатны для сяброў Т-ва Беларускае Школы і для адумысна запрошаных гасьцей.

Да ўгодкаў сьмерці Максіма Багдановіча. У сувязі з дзясятымі ўгодкамі сьмерці нашага вялікага песьняра Максіма Багдановіча, якія прыпадаюць 25-га гэтага мая, — перадрукоўваецца зборнік вершаў паэта „Вянок“ з прадмовай Адт. Навіны. Адначасна выйдзе партрэт паэта, зроблены літаграфскім спосабам. Чарговы № 3 „Родных Гоняў“ будзе зьмяшчаць рад твораў Максіма Багдановіча, некалькі вершаў, пасьвячоных ягонай памяці, і дзьве стацьці: д-ра **Ігната Дварчаніна** — аб творчасьці паэта наагул, ды **Ант. Навіны** — „Праблемы красы і мастацтва ў творах М. Багдановіча“.

Як нас інфармуюць з Менску, там к угодкам выйдзе першы том поўнага сабраньня твораў М. Багдановіча (500 стр.) — выданьне акадэмічнае Інстытуту Беларускае Культуры.

Хадэцка-сельсаюзьніцкі „супрацоўнік“. У хадэцкай „Бел. Крыніцы“ і сельсаюзьніцкай „Сялянскай Ніве“ здаўна працуе „літэратурны крытык“, паляк, які падпісуецца псэўданімам „Сьветазар“. „Не брезгает“ ён і заробкамі другога роду: гэтак надовячы ён зьмясьціў у абшарніцкім „Слове“ стацьцю „Аб беларускай прэсе“, падпісаўшы другім ведамым сваім псэўданімам К. См. (Смрэчыньскі), пры чым запоўніў яе радам даносаў перадусім на... сваіх хлебадаўцаў хадэкаў і сельсаюзьнікаў, не абмінуўшы, ведама-ж, і нашае часопісі. Дасталася навет і зусім апалітычнаму месячніку „Родныя Гоні“—відаць за тое, што не зьмяшчае твораў „ведамага крытыка“ Сьветазара... Наагул, стацьця мае характар „мэльдунку“, „куды трэба“!

Ну і „супрацоўнікі“ ў нашых хадэцка-сельсаюзьніцкіх „прыяцеляў“! Пасьля рэдактара Міцькі—Сьветазар... На такіх „стаўпох“ ня доўга будзеш „будаваць Беларусь“!

Зьезд жыдоўскае прэсы ў Вільні. 22, 23 і 24 мая ў Вільні будзе адбывацца зьезд прадстаўнікоў жыдоўскае прэсы з усяе Польшчы.

Афіцыяльны курс грошы на 20 траўня. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

20./V. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Хадэцкая крывадушнасьць.

Ня так даўно, калі грам. Луцкевіч апублікаваў выступленьне хадэцкага павадыра, кс. Станкевіча, у справе аддачы Вільні Літве,—хадэцкі дзеяч агідна вылаяўся, кажучы, быццам усё гэта — брахня, ды што ягоныя пагляды на пытаньне аб Вільні—ўсім ведамы.

Пераглядаючы гадавік ксяндзоўскае „Крыніцы“ з 1921 году, мы ў перадавіцы ў № 20 знайшлі зусім ясна высказаныя гэныя „ведамыя пагляды“. У стацьці „Беларусы і Віленшчына“ чытаем там даслоўна наступнае:

„Незалежная Літва (магчыма з найбольшай беларускай тэрыторыяй) са сталіцай у Вільні, поўнае роўнапраўе ўсіх народнасьцей—вось разьвязка Віленшчыны“...

Калі сталіцай Літвы кс. Станкевіч абвясьціў Вільню, аддаўшы датаго-ж „магчыма найбольшую беларускую тэрыторыю“, — дык ясна, што мусіў „падараваць“ Вільню Літве, бо і ў 1921 годзе Вільня да Літвы не належала!

Каб кс. Станкевіч ня мог цяпер выкручавацца, кажучы, быццам гэная фраза папала ў ягоную газэту „праз недагляд“, ці „абмылку“, мы мусім расказаць цікаўную гісторыю гэнага нумару. Бо-ж у нас ёсьць у руках другі экзэмпляр таго-ж № 20-га, у якім тая-ж перадавіца канчаецца крыху інакш: там гаворыцца аб беларуска-літоўскай фэдэрацыі! Але гэты другі варыянт таго-ж самага нумару часопісі прадстаўляе бібліаграфічную рэдкасьць, і вось дзеля чаго.

Калі ўжо № 20 „Крыніцы“ йшоў на машыну, адказны рэдактар, прачытаўшы пададзеныя вышэй словы, ажно жахнуўся, ды на сваю руку перарабіў канец перадавіцы ў фэдэралістычным духу. З такой пераробкай газэту пачалі друкаваць. Але ў той час, калі друк яе ўжо канчаўся, у друкарню прыйшоў кс. Станкевіч. Убачыўшы пераробку, загадаў друкаваньне спыніць, усе адбітыя экзэмпляры зьніштожыць, ды друкаваць у тым відзе, як было спачатку,—нанова...

Гэтак заява аб аддачы Вільні з „магчыма найбольшай беларускай тэрыторыяй“ зроблена з ведама і па асабістаму загаду кс. Адама Станкевіча, і гэты пагляд ягоны на пытаньне аб Вільні—ведамы ўсім.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ

Спэктакль у вёсцы Вялікая-Слабада.

(Ярэміцкае гміны, Стаўпецкага павету).

26 га красавіка г. г. наша вёска ў першы раз за ўсё сваё істнаваньне мела мажлівасьць пабачыць спэктакль, зладжаны мяйсцовым гуртком Т-ва Беларускае Школы. Ня гледзячы на вялікія перашкоды і нястачы з тэхнічнага боку, а гэтак сама і на тое, што артысты ў сваей пераважнай большасьці гулялі на сцэне першы раз у жыцьці, гульню можна назваць—мастацкаю. У „Заручынах Паўлінкі“, Аўгеньня Напорка (Паўлінка), В. Кісьцень (Якім), Алена Пулка (Альжбета) і другія далі сваею мастацкаю гульнёю вельмі яскравы жыцьцёвы абразок вёскі. Добра згулялі „Зьбянтэжанага Саўку“, гдзе Аляксандар Карп (Саўка) і Алена Пулка (Магрэта) гэтак рэльефна правялі гэты жыцьцёвы жарт, што часам, гледзячы на сцэну зусім забываешся і думаеш, што перад табою праходзіць узапраўды адна з прыкрых, але ўсё-ж жыцьцёвых сцэн сучаснае вёскі. Ня гледзячы на дажджлівую пагоду, памешканьне не змагло зьмясьціць усіх прысутных і многім прышлося адмаўляць з-за нястачы мейсца. В. Слабодзкі гурток Т-ва Бел. Школы шчыра дзякуе гаспадару памешканьня Андрэю Печка, які, ня гледзячы на цяжкія жыцьцёвыя абставіны, пайшоў на сустрэчу добрым пачынаньням лепшае часткі вясковага грамадзянства, а гэтак сама і ўсім тым грамадзанам, якія сваею прысутнасьцю ўшанавалі спэктакль-вечарыну.

„Прысутны“.

З усіх бакоў ашукваюць.

(Слонімскі пав.).

Хто не пазьдзекуецца, хто не пасьмяецца над нашым цёмным беларусам?

Быў у вёсцы Лявонавічах, Казлоўскае воласьці, колішні польскі вучыцель — Белавус. Як звольнілі яго з пасады, зачаў ён гандляваць сьвіньнямі. Ведама, з сьвіньнямі хоць слаўны ня будзеш, а багатым станеш: так і наш Белавус захацеў адразу збагацець: купіў у нашым мястэчку сьвіней і вагонамі адвозіў у Варшаву. Плаціў больш за другіх амаль-што па 5 залатовак за пуд, але ж усіх грошаў не аддаваў адразу — прыехаўшы з Варшавы расплачваўся. Ажна апошні раз, якраз перад калядамі набраў ажно 35 сьвіней. Браў усё штукі вялікія і добрыя, па 200, 300 злотых за штуку, а грошаў даваў задатку—каму 5 зл., каму 10, а як хто надта прыставаў, то даваў і больш. Яшчэ і бутэльку вып'е з некаторымі, і ўсё на свой кошт. Лявонаўскія людзі перавезьлі ўвесь тавар у Слонім да цягніка — ім таксама не плаціў. Апрача таго, у некаторых узяў грошы на абмен (даляры), у аднаго 60 даляраў і ў іншых па некалькі, а у лясьнічага са скупы, казалі, нешта тысячу, ці больш, залатых. Дый як паехаў, так паехаў. Чакалі людзі чакалі і годзі сказалі!..

Была гутарка, што бачылі яго, як садзіўся на параход — ехаць у Амэрыку, што, езьдзячы ў Варшаву, — уперад выбраў сабе дакумэнты і паехаў сабе.

Сабраліся ўсе гэтыя прадаўцы парадзіцца, што рабіць, і пастанавілі зьвярнуцца да адваката, заявіўшы ўперад паліцыі. Трэба было да ўсяго яшчэ трохі грошаў далажыць.

Як там было, так было, ажно аднаго разу зьяўляецца і сам Белавус у Казлоўшчыне. Аж зіхнулі людзі ўбачыўшы! І пытаюцца адзін у аднаго: „Ну што, як? Мы вось і ў пастарунак заяўлялі, і ўсюды, а ён сабе ходзіць, як ні ў чым ня бывала“! Кажуць, што некалькі дзён нат' у вастрозе пасядзеў, але выпусьцілі пад залог за 7.000 злотых. Цікавасьць, скуль-жа гэтыя грошы ў яго ўзяліся, калі ён да гэтага выпадку нічога ня меў? Праз пару дзён прадаў хату (якая была запісана на жончына імя) і кажуць, што і жонку забраў, ды зноў паехаў у Варшаву, бо, кажуць, там купіў сабе самаход і адчыніў прачкарню...

Вось дык бяскарнасьць для зладзеяў!

А. Надзея.

Хто вінаваты.

(Слонімскі пав.).

Шмат гаварылася заўсёды аб зямельнай рэформе—(нат' у горле яно ўжо стаіць!). Даўно гэта, даўно было, калі зачалі гаварыць аб ёй, шмат ужо намазолілі вочы гэтыя словы: „зямельная рэформа“, аб якой гаварыў і Сойм і Урад і друкавалася ў газэтах; але-ж ці была каму карысьць з гэтага? Як было некалі, так і цяпер і далей гэтак мусіць будзе цягнуцца, а колькі бяды, колькі няшчасьця ў зьвязку з гэтаю зямлёю бачыма мы што-дзень. Ужо няма чаго гаварыць, што беднасьць і нястача пануе ўсюды, і селянін ня ведае, як з яе выкараскацца;—гэта даўно ўсім вядома. Але яшчэ і сваркі дамовыя, ды калатні, даводзячыя ня раз да поўнага зьніштажэньня гаспадаркі ды гаротнага жыцьця гаспадароў, — таксама бываюць гэтаю прычынай.

Шмат маем прыкладаў: вось, хоць гэткае здарэньне было ў в. Русакі, Казлоўскае воласьці. Хто там ня ведаў Лаўрына Гародку, які жыў сабе з сваімі двума сынамі так згодна і добра, што кожны ў вёсцы мог пазайздросьціць?! Гаспадарка яго малая, усяго тры дзесяціны зямлі, — разам з сенажацьцю, лесам і пляцам, што пад будоўлю, дык працавалі на чужых землях — на трацякі, езьдзячы за 5 — 7 і болей вёрст. Але сталася, што памерла Лаўрынава жонка, і, як чалавек яшчэ малады, ён ажаніўся другі раз. А перад гэтым жаніўся і яго старшы сын. Троха пачакаўшы, пайшлі такія сваркі і калатні за гэтую зямлю і ўсю маемасьць, што няхай нас людзі добрыя бароняць і чуць усё гэта! Бацька зямлі хлопцам не дае, хлопцы адбіраюць: адныя сеюць, другія хочуць жаць. Няма рады — хлопцы карову за рогі ды на торг, як бацька адлучыўся з хаты. Мусіў такі старшы сын уступіць, вышаў з хаты (ціхі быў), а малодшы ўцёк у батракі. Гэтак марнуецца дабро, так цяжка нажытае і марнуюцца людзі. А дзеля чаго ўсё гэта, няхай мне хто скажа? Яж думаю, каб гэтым людзям ды тая „зямельная рэформа“ дала-б яшчэ крышачку зямлі, замест слоў, то ня трэба было-б ім калаціціся за гэтую стужачку.

А. Надзея.

Каму служаць?..

(З Ваўкавыскага павету).

У пачатку 1926 году ў сяло Дзятлавічы, Ваўкавыскага павету, быў прысланы для выкананьня абавязкаў парахвіяльнага сьвяшчэніка манах Алімпі, які радзіў парахвіянам—дзеля захаваньня іх царквы, якую ўлада маніцца зачыніць,—перайсьці ў вунію.

Парахвіяне, бачучы, якога айца ім прыслалі, зразумела, настаражыліся і, недавяраючы яму царквы, ключы ад яе запрапанавалі трымаць сваіму царкоўнаму старасьце Язэпу Кулакоўскаму, грамадзяніну ўсімі вельмі паважанаму, і іншым выбарным, якія павінны адмыкаць царкву дзеля адправы службы, а пасьля ключы зноў браць да сябе. Такія адносіны, як зусім ненармальныя, змусілі-бы сумленнага чалавека выехаць з парахвіі. Але мусіць ацец Алімпі атрымаў нейкі загад, які ён павінен выканаць. У гэтым яму дапамагаюць сьвяшчэньнікі мястэчак: Росі—Хвядос Дзеціеўскі, Воўпы—Петрапаўлаўскі, ды сам Ваўкавыскі „благачынны“ Уладзімір Хоміч. Алімпі езьдзіць у Дзятлавічы не адзін, але, як і выпадае „паважнай духоўнай асобе“, з прадстаўнікамі ўлады — урадоўцамі ды паліцыяй, каб адабраць ключы ад царквы і царкву, якая ніколі ня была ні каталіцкім, ні вуніяцкім касьцёлам, зачыніць. Пакуль-што царкоўны староста грам. Кулакоўскі засуджаны на месяц у вастрог. Аднак-жа такая кара ня здолела зламаць стойкасьці ані парахвіян, ані самога грам. Кулакоўскага, і яны яшчэ з большай энэргіяй бароняць сваю царкву ад націску „ай-

цоў духоўных". Лічучы, што самым стойкім у абароне царквы зьяўляецца грам. Кулакоўскі, айцы нашы рашылі замяніць на становішчы царкоўнага старасты гр. Кулакоўскага другой, больш паслушнай ім і падатлівай асобай. З гэтай мэтай, пачынаючы ад лютага, ужо два разы прыяжджалі ў Дзятлавічы „айцы": першы раз—„благачынны" Хоміч з Дзеціеўскім з Росі, урадоўцам і паліцыяй, а другі—Петрапаўлаўскі з Воўпы, каб выбраць новага старасту; але парахвіяне моцна стаяць за грам. Кулакоўскага і абодва разы зноў выбралі яго-ж. Цяпер свой „ацец" Алімпі аб'явіў, што, калі ключэй не аддадуць яму, — дык царква будзе зусім зачынена.

Той-жа „благачынны" Хоміч у Воўпе абляяў таксама паважанага грам. з вёскі Лазы Баўтрукевіча, які пацягнуў айца" благачыннага да судовай адказнасьці, але „благачынны", спалохаўшыся, даў гр. Баўтрукевічу на згоду 250 зл.

Вось маема „айцоў"! **Абураны.**

Бязладзьдзе.

(З Горадзеншчыны).

У вёсцы Лакно, Азёрскае воласьці, Горадзенскага павету, яшчэ ў 1926 годзе выбралі на солтыса Сяргея Жука, а на памоцніка Янку Кірэя. Але хутка спрытныя брахуны накінуліся на яго і сталі чарніць, бо ён у свой час быў старшынёй Гуртка Грамады. Дык, ня гледзячы на тое, што ён выбраны цэлай вёскай і чэсны чалавек, скінулі яго са становішча солтыса, а толькі Янку Кірэя зацьвярдзілі на памоцніка, і ён заступаў солтыса ўвесь час. Але за гэты час **ён** надта расфанабэрыўся і стаў сунуць свой **нос**, куды трэба і куды ня трэба, — дык **вёска** паставілася процi яго.

Прайшло шмат часу, а солтыса ўсё няма. Урэшце войт прыехаў у нашу вёску, каб выбраць новага солтыса. Выбралі **ўжо** здаецца добрага **чалавека, чэснага і беспартыйнага — Міхала Каршакоўскага. Але зараз і глухія і нямыя загаварылі процi яго, і чаму — невядома! Дык яго доўга не зацьвярджалі на солтыса. А прычынай** гэтага, як **аказалася, было вось што (так адказалі Каршакоўскаму, калі ён пачаў навадзіць спраўкі): не зацьвярджалі яго таму, што жыве ён на адным панадворку з сваякамі, на якіх хтось сказаў, што яны камуністы, і таму, што паліцыя не дала аб ім добрай „апініі".**

Гэтак у працягу двух месяцаў скінулі двух солтысаў і невядома, хто скінуў: ці Стараста, ці тутэйшы пан Радзевіч, ці хто іншы. Вёска зноў бяз солтыса. Нездаволеная такім зьявішчам, яна сама бяз пана Радзевіча выбрала другі раз Міхала Каршакоўскага і падала на зацьверджаньне старасьце. Але адказу не атрымала ніякага.

Хутка знашлі новага чалавека на солтыса вёскі Лакно і пасадзілі яго бяз ведама і згоды вёскі. Гэтым новым аказаўся Іван Ільіч Кашчэй, не абы хто. Да вайны быў ён дзесь у Варшаве маленькім чыноўнічкам, пасьля быў прапарам і ваяваў супроць рэвалюцыі, быў і ў арміі Дэнікіна і папаў аж у Архангельск, адкуль зьявіўся ў Польшчы. Тут ён пачуў сябе вольна і думаў, што зноў будзе дзесь чыноўнічкам. Але нічога яму не ўдалося. Дык і мусіў застацца ў нашай вёсцы і прыняць прапанаваную яму праз нашых паноў пасаду солтыса, і цяпер ён у нас солтысам, ня гледзячы на тое, што яго ніхто ў вёсцы ня хоча, і ніхто яго не выбіраў! Ну, хоць самазванны, але ўсё-ж чын. Вёска, ясна, ня хоча мець самазваннага солтыса і непажаданага ей памоцніка, дык усе процiў іх, і робіцца ў нашай вёсцы, як у Кітаі ўсёроўна, розьніца толькі ў тым, што ў нас з гармат не страляюць. Але за тое нашы паны добра языкамі страляюць. А ў вёсцы фактычна бязладзьдзе.

Дык дзе-ж тая праўда? Паводле Канстытуцыі Польскай Рэспублікі народ сам выбірае солтысаў і войтаў, а фактычна дык яно інакш выглядае. Бульба.

Дарагі сабака.

(Горадзенскі павет).

Грамадзянін вёскі Карневічы, Горніцкае гміны, Горадзенскага павету, Сільвэстар Баран у кастрычніку мінулага году вёў свайго старога сабаку да „гыцля" ў Горадню, каб пазбыцца яго. У вярстох трох ад яго вёскі па дарозе ў напрамку да Горадні сустрачае яго паліцыянт Капцёўскага пастарунку, Заманчынскі, і, зьвярнуўшыся да грам. Барана „czemu pies jest nie przywiązany" — зачаў пісаць пратакол. Селянін зачаў тлумачыцца, што ён вядзе сабаку забіць, і што панок можа яго застраліць, і гэтым самым ня прыдзецца яму цягнуцца ў такую далёкую дарогу; але паліцыянт і слухаць не хацеў (вядома: яму патрэбен пратакол, каб даказаць начальству, што ён працуе і што незадарма хлеб есьць)...

Так прайшло добрых паўгода, пакуль гэты пратакол вандраваў па паліцэйскіх і судовых установах. Аж цяпер раптам прыходзіць назад абярнуўшыся ў форму наказа на 11 злотых штрафу... І за што, спытацца? а тымчасам настае рабочая пара, трэба абсяваць поле, а ў гэтага сяляніна толькі і ёсьць два пуды семя для абсеву.

Вось цяпер і рабі, што хочаш: прыходзіцца апошняе семя прадаваць, каб заплаціць гэты штраф, бо пісар у воласьці кажа, што, як не заплоціш, то спагонім „drogą sekwestracyjną". **Молат.**

Як памсьціліся.

(Віржы Ваўкалацкай гм., Дзісенскага пав.).

На запусты было ў нас вясельле ў Баброўіча, на якім граў музыкант Ліцьвін (тайнік).

Сыграўшы адну польку, Л. разам з зяцеям Найлаўца (паляк з-пад Варшавы) стаў цяяць польскія салдацкія песьні, адначасна загадаўшы хлапцом, што былі на вясельлі, зьняць шапкі. Хлапцы, ня хочучы быць пасьмешышчам у вачох прысутных старэйшых асоб і дзяўчат, дый уважаючы гэта за зьдзек — не паслухалі. За гэта Баброўіч разгневаўся і забраў музыку ў сваю хату.

У адказ на гэта моладзь назаўтрае не пайшла на вясельле, а залажыла вечарынку. Гэта надта абразіла вясельнікаў, бо ніхто не пайшоў на вясельле, гэткім чынам змушаючы маладых весяліцца самым. Ліцьвіна-ж ударыла гэта па кішані: мала сабраў за маршы. Дык пастанавілі памсьціцца.

Сказана, зроблена: Ліцьвін, пайшоўшы на пастарунак, данёс, што шэсьць хлапцоў, уваружаных бомбамі і вінтоўкамі, напалі на вясельле і сілай яго разагналі. Вясельнікі ў ліку 4 чалавек (Чыкун, Б. і Е Баброўічы і Найлавец) гэта падцьвярдзілі.

Назаўтрае зьявілася паліцыя, перагрэсла хаты абвінавачаных і, не знайшоўшы нічога, арыштарала аднак 6 хлапцоў, з якіх Штура ня быў у той вечар дома.

„Бадаць" арыштаваных прыяжджаў нейкі чыноўнік з Вільні, які звольніў Ермаковіча, бо, як хваліўся Е., служачы ў войску разам выпівалі. Рэшту ў ліку чатырох (Ш. звольнілі перш) адаслалі ў Вільню.

Характэрна, што камандант Ваўкалацкага пастарунку быў у той дзень на вечарыне і ведаў добра, што Л. і інш. сьведчаць фальшыва, аднак хацеў яшчэ ў вёсцы закаваць нявінных хлопцаў. **С. Свой.**

З Т-ва Бел. Школы.

Ушануйце памяць М. Багдановіча.

Галоўная Управа Т-ва Белар. Школы гэтым заклікае ўсе гурткі Т-ва на мясцох, каб у суботу, 28 мая (а гдзе немагчыма, дык і пазьней), уладзілі паміланьне Максіма Багдановіча з прычыны 10 х угодкаў сьмерці паэта, якія прыпадаюць на 25 мая.

Т-ва рассылае ўсім гурткам: пасьвячоны творчасьці М. Багдановіча нумар „Родных Гонаў", новае выданьне „Вянка" і партрэт М. Багдановіча, які мусіць быць выстаўлены ў часе абходу.

На абходзе трэба прачытаць рэфэрат аб творчасьці паэта. Можна дзеля гэтага карыстацца матэрыяламі, зьмешчанымі ў рассыланых друках. Пасьля рэфэрату — дэклямацыя вершаў М. Багдановіча, ды па магчымасьці пяяньне.

Кожын гурток павінен загадзя зьвярнуцца да адноснае ўлады з просьбай аб дазвол, прадставіўшы праграму вечара, тэзісы праектаванага рэфэрату (або і цэлы рэфэрат, калі маеце чытаць ужо надрукаванае), тэксты вершаў, прызначаных да дэклямацыі, ці да пяяньня.

Калі да 28-га не пасьпееце ўсё наладзіць, сьвяткаваньне можна адлажыць на тыдзень, або й болей, як вам будзе спадручней.

Галоўная Управа.

Падзяка.

Востраўскі Гурток Т-ва Бел. Школы, Старавескай гм., Слонімскага пав., выказуе шчырую падзяку грамадзяніну тэй-жа вёскі Сэрафіму Лук-Татарыну, які першы адгукнуўся на заклік Гуртка да ахвяраваньня кніжак на бібліятэку-чытальню імя сэнатара А. Уласава і ахвяраваў 35 кніжак у беларускай і іншых мовах. Хай гэта ахвярнасьць будзе прыкладам для другіх. Чэсьць табе, праўдзівы сын працоўнага народу і нашай загнанай Бацькаўшчыны.

Вострава, 10/V. 27 г.

Сэкрэтар Упраҽы П. Крынчык.

З жыцьця беларускага інтэлігента.

(*Фельетон*).

Я пастанавіў пісаць—і пісаць аб жыцьці беларускага інтэлігента.

Устае ён а 6 гадз., часам навет і ўвечары, калі няма чаго есьці, калі жывот дамагаецца права на ежавое здаваленьне, і калі ён пэўны, што нідзе і ні ў кога ня можна пазычыць... Тады ён ляжыць... І думкі аб лепшай долі і волі снуюць такія прыгожыя ўзоры будучыні, што, здаецца, забываешся аб усім. Ен выабражае яе — ясную, сьветлую, бліскучую, калі ўсе працоўныя будуць пэўныя працы і кавалка хлеба...

Але сучаснасьць хутка разьвявае гэтыя думкі!..

Часта, аднак, ён устае і зраньня. Тады ён апранаецца і сьпяшае. Спытайся: куды?

— Справы, справы, справы—цэлы аркуш бы сьпісаў справамі.

У „Маланцы":

— Добры дзень!

— Дабрыдзень!

— Вось... бачыце, я тут прынёс тое-сёе. Можа, бачыце, авансік...

— Ах, чорт ведае!..—злуе рэдактар.

— Ну, ну, нічога! Тады я пачакаю... Мо' папіроску маеце?

— Калі ласка!

Ен рады, што хоць папіроска ёсьць! І—то хлеб!

Тое самае ў іншых рэдакцыях... толькі папіроска!

Вуліцы... Аўтабусы... Рух...

А ў вокнах такія смачныя рэчы... А тут—хлеба няма!

— Ах,—думае ён,—Хрыстос мыляецца, калі кажа: „птушкі ня жнуць а ядуць — ня вы-лі есте!? Вось тая розьніца між птушкамі і людзьмі!

— І хто тут вінаваты!?

І вось тут якраз усплывае наўзьверх тая соцыяльная няроўнасьць сучаснага грамадзянства, дзе адзін — багаты, а другі — голы...

А дзе духовае жыцьцё?! Дзе ідэалы?! Калі задача дня—кавалак хлеба!

Ен так і прызвычаіўся. Устае і думае: які сягоньня маем парадак дня?—І адказвае: сягоньня на парадку дня: хоць раз салідна падажраць...

Адзіны выхад: Ісьці на станцыю і для „имущих" насіць чэмаданы... На абед можна надзарабіць. **Калі гэтак удасцца, ён—рады... Яго радасьці няма граніц! Ен жыве! Ен гатовы тварыць і любіць, і верыць у жыцьцё, у сьветлую Будучыню.**

Пачка папіросаў на стале... Ен сядзіць згорбіўшыся за сталом і піша ў рэдакцыю. Шмат думак... Ен-бы пісаў аб нядолі, аб змаганьні, аб крыўдзе бедных, ён бы высьмяяў едкім сьмехам багатых, паноў—але...

„Сканфіскуюць"!

— Дык што-ж пісаць?!

— „На злобу дня"!

Вось абразок, як жыве беларускі інтэлігент, у той час, калі беларускі народ патрабуе сваіх вучыцялёў, дамагацца родных школаў! Але тут паставім „але" і... пункт.

Бім-Бом.

Усячына.

Дзяржаўныя даўгі Польшчы.

Пад гэтакім загалоўкам у газэце „Dziennik Kresowy" ад 28/IV 27 г. была зьмешчана цікаўная заметка, што ў Польшчы ёсьць даўгоў на агульную суму 3,572,095,317 зл., ці, інакш кажучы, на галаву кожнага грамадзяніна Польскае Рэспублікі прыпадаець па 132 зл.

Каралеўскі скандал у Гішпаніі.

Гішпанскі дыктатар дэ Рывэра „запрапанаваў" раду гішпанскіх унівэрсытэтаў — у зьвязку з 25-лецьцем панаваньня караля Альфонса—выбраць яго „ганаровым доктарам", дый яшчэ—права. Відаць — у падзяку за тое бясправе, якое пануе асабліва ў апошнія гады—ад дня захвату ўлады дыктатарам Рывэрай, які разагнаў парлямант, павыкідаў з унівэрсытэтаў шмат апазіцыйных дзеячоў, слаўных пісьменьнікаў ды прафэсараў — за крытыку пануючых у краі агідных парадкаў. І вось, гішпанскія прафэсары ў сваіх аўтаномных унівэрсытэтах аказаліся запраўды ж на вышыні свайго палажэньня: у вялізарнай большасьці ўнівэрстытэцкія рады адмовіліся прысудзіць гэтае высокае, але незаслужанае званьне „доктара праў" каралю, з дазволу якога рабіліся ды робяцца ўсе гэныя агідныя бяспраўі...

Хто чытае нашу газэту і не прысылае надпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце надпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

БРАТЫ БЕЛАРУСЫ!

Сьвіслацкі Гурток Т-ва Белар. Школы, закладаючы яшчэ адну новую пляцоўку ў нашым адраджэнскім руху—бібліятэку, зварачаецца да вас з гарачым словам мальбы: **памажэце нам!**

Ваша ахвяра: ці то грашыма, ці то кніжкамі, зложаная на алтар роднай культуры, будзе тым дзейнікам, які павядзе наш гаротны народ беларускі наперад — да вызваленьня ад апутаўшых яго ланцугоў цемры.

Хоць сягоньня хмары суму і бяды абвалаклі нашу бацькаўшчыну, хоць гора і нэндза крэпка ўкараніліся ў нашым жыцьці, хоць усюды недастатак—безграшоўе, — але калі, як не цяпер, мы мусім „церабіць сабе сьлед", каб было „ўнукам паваньне там, гдзе сягоньня плача дзед"?!

Няхай віхор дзьмець, а мы, браточкі, будуйма родную культуру; будуйма ўсё новыя і новыя пляцоўкі самаасьветы; будуйма новае жыцьцё!

Дык памажэце ж нам!

Ахвяры можна скіроўваць у рэдакцыю, або слаць на адрэс: m. Swisłocz, pow. Wołkowyski, Kaczanowski Konstanty.

**Управа Гуртка Т-ва Б. Школы
ў м. Сьвіслачы.**

Управа гуртка Т-ва Б. Ш. у м. Сьвіслачы дзякуе гр. гр. Кастусю Вarановічу, К. Аўсейчыку, П. Баўвану, П. Габцу і М. Янушкевічу за 5 злотых, якія зложылі на бібл.-чыт. пры гуртку.

Няхай ваша ахвярнасьць, грамадзяне, будзе сьветлым прыкладам нашым братом, якія дагэтуль яшчэ асьлепаены цемраю, няхай гэны чын будзе ўвекавечаны для пакаленьня.

**Управа Гуртка Т-ва Б. Школы
ў м. Сьвіслачы.**

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.